БЮЛЕТЭНЬ

Соймавага Клюбу „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада“

№ 4 | Вільня, Чацьвер 17 сьнежня 1925 году. | № 4

Прамова

дэпутата Сымона Рак-Міхайлоўскага з Соймавага Клюбу Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады, сказаная на паседжаньні Сойму 12. XI. 25 г. ў часе дыскусыі над expose Міністра Скарбу і разьважаньняў аб бюджэце на 1 квартал 1925 году.

Паны! Слухаючы expose Міністра фінансаў п. Зьдзехоўскага, прыпомнілася мне вельмі трапная думка, што „Розьніца паміж разумным чалавекам і, так сказаць, неразумным заключаецца ў тым, што першы вучыцца на памылках іншых, а другі нічога ня можа навучыцца нават і на сваіх уласных памылках“.

І вось, на жаль, трэба прызнацца, што Польскі „дзяржаўны гэній“ значна болей зблізаны да гэтага другога тыпу.

Адною з галоўных прычынаў раду вельмі непамысных памылак, зробленых польскім грамадзянствам, памылак, якія могуць пацягнуць за сабою нямінуючую катастрофу, зьяўляецца якаясьць дзіўная неахвота польскага грамадзянства пазнаць праўду, пазнаць непабарымыя правы грамадзка-дзяржаўнага жыцьця.

Відаць, фактычна ня добра робіцца ў Польшчы, калі адзін з нядаўна паўсталых тут Соймавых Клюбаў на ўступе свайго партыйнага маніфэсту шчыра зазначыў, што „ў Польшчы замнога ілгуць“ і дэвізам свае дзейнасьці пастанавіў выкрыць праўду перад няпрывыкшым да яе польскім грамадзянствам.

Але гэтая праўда гэтак няпрыемна, а нават страшна для Польшчы, прывыкшай жыць пад цёплым крылом Францыі, што яна ніколі не асьмеліцца глянуць праўдзе проста ў вочы. Бо найлепшым доказам гэтага страху прад праўдай ў Польшчы ёсьць тое, што ў часе найболей крытычным для Польшчы на кіраўніка Ураду высунулі таго, што мае непараўнаны талент хаваць гэтую горкую праўду ў сваім салодкім красамоўстве.

Ды й нават сама буржуазія ня верыць гэтаму свайму прэм'еру, кіраўніку свайго „коаліцыйнага“ ўраду, ня гледзячы на тое, што ўрад гэты нібы меў злучыць у сабе ўсё, што ёсьць найлепшага ў валадаючых клясах. Бо-ж бачылі мы, нават Соймавая Кам. Загр. Спр., хоць згадзілася пад націскам на жаданьне п. Скшыньскага, але выразна дала зразумець, што ня верыць у яго запэўніваньні аб яго дыплёматычных нібы трыўмфах.

Як відаць з вышэйшага, ужо няма нават і ў польскім грамадзянстве веры ў палітыку п. Скшыньскага, бо ўсе, відаць, зразумелі, што яго палітыка —гэта палітыка капітуляцыі.

Але яшчэ меней веры мае польскае грамадзянства, не гаворачы ўжо аб болей цьвярозых меншасьцях, да гаспадарчых здольнасьцяў як п. Прэм'ера, так і яго міністра фінансаў п. Зьдзехоўскага.

Сёньня няма ўжо ў Польшчы нават тае веры, якая была тады, калі распачаў сваю катастрафічную „санацыю“ п. Грабскі.

Для характэрыстыкі пануючых цяпер у Польшчы настрояў я скарыстаюся вельмі красамоўнымі паведамленьнямі галоўных кіраўнікоў Польскай фінансавай гаспадаркі: і вось — прэзэс Польскага банку ў прэсавым інтэрвью сьцвердзіў „вельмі непажаданыя настроі сярод шырокіх мас люднасьці“, „панаваньне сярод польскай люднасьці пацучьця абсалютнай няверы ў магчымасьць выхаду з цяперашняга палажэньня“, „хваравлівую няверу ў сябе...“. Нават мін. Зьдзехоўскі быў змушаны сьцьвердзіць крызіс даверыя.

А хто-ж скажа, што гэтая суб'ектыўная нявера ў магчымасьць ратунку ня мае аб'ектыўных падставаў у гаспадарчай разрусе і агульным зьбядненьні краю?

Надалей вытрымаць ані „санацыі“, ані „стабілізацыі“, ані „дзяржаўных бюджэтаў“ люднасьць беларускіх і украінскіх зямель, а таксама люднасьць каранной Польшчы болей ня здолее.

Нават сам міністар фінансаў, якому яго становішча наказвае афіцыяльна быць аптымістычным, які першы мае абавязак стварыць дадатны псыхічны настрой для падтрыманьня ня маючай, відаць, іншых падстаў польскай валюты, быў змушаны сьцьвердзіць у сваім expose, што Польшча стаіць напярэдадні гаспадарчае разрухі.

„Прадукцыйныя сілы краю вельмі аслаблены падатковымі высілкамі апошніх гадоў“—гаварыцца вельмі дэлікатна,

Сьцьвярджаем тут катэгорычна, што фактычна прадукцыйныя сілы краю аграблены і зусім зруйнаваны, але гэта яшчэ далёка ня ўсё. Другая палавіна гэтае праўды крыецца ў тым, што той колёсальны падатковы высілак зусім змарнаваны, што тыя колёсальныя сумы, зьдзёртыя з беднай люднасьці Беларускіх і Украінскіх зямель і каранной Польшчы, выкінутыя на непрадукцыйныя выдаткі, кінутыя на армію, якую хутчэй можна залічыць да гаспадарча-руйнуючай, чым мілітарна баронячай край...., кінутыя на падтрыманьне штучна створанага прамыслу, які, ня гледзячы на ўсю гарантыю, гіне, ня маючы цяпер крэдытаў і рынкаў.

Тыя жывыя сокі, выпампаваныя падаткавымі помпамі п. Грабскага, пераліваюцца і надалей з прадукцыйных і маючых прышласьць сялянскіх гаспадарак у старыя струхлелыя, засуджаныя гісторыяй на сьмерць, склеротычныя артэры абшарніцтва.

Дык трэба нарэшце прызнацца адкрыта, што ўсе гэтыя колёсальныя сумы, якія былі зьдзёрты часта прымусам, гвалтам, ашуканствам, сэквэстрацыяй і гэт. пад. способамі з працуючых масаў, зусім змарнаваны датыхчасовымі польскімі ўрадамі. Вось кароткая, але красамоўная, праўда аб тым, што зрабіла панаваньне польскае буржуазіі і польскага абшарніцтва ў краі!

З гэтага відаць, што п. Грабскі, творачы новую валюту, фактычна асягнуў тыя самыя рэзультаты, якіх дасягнулі яго напярэднікі ў часе панаваньня гэтак званае „інфляцыйнае“ маркі. Як тады, так і цяпер, ці то шляхам „інфляцыі“, ці то шляхам „санацыі“, рэзультаты панаваньня буржуазна-абшарнічых урадаў для шырокіх працуючых масаў і для цэлага краю абсалютна аднолькавы.

І вось цяпер найадпаведнейшы час, каб з гэтага досьледу зрабіць нарэшце патрэбны апошні вывад. Што да зьместу гэтага вываду, то ён можа быць толькі гэтакі: польская буржуазія аказалася **абсалютна няздольнай**, каб наладзіць гаспадарчае жыцьцё краю, а толькі здольна **дарэшты зруйнаваць яго.** Зразумелая рэч, што паразіт буржуазіі, высcаўшы ўсе жывыя сокі краю, гэтым самым згубіць нарэшце і сам сябе, бо жыве і жывіцца працаю і крывею сялянскіх і работніцкіх масаў. Забойства польскай буржуазіі — вось няўхільны выхад са ўсяе працы пануючых да гэтай пары ўрадаў у Польшчы.

Польская буржуазія дайшла да канца. Вычарпала і змарнавала ўсе сілы і ўсе магчымасьці, згубіла да сябе даверые ў краі і заграніцаю, а нарэшце, як то сьцьвердзіў сам стораж і абаронца ўсіх запасаў польскае валюты п. прэзас Карпінскі, згубіла і сваю апошнюю псыхічную надзею—згубіла веру ў сябе. Бо новы ўрад ужо гэтае веры ня мае!

Апошняй надзеяй паноў, таксама ўраду і ўсіх буржуазных угрупаваньняў зьяўляецца — пасьля зраўнаважаньня бюджэту — надзея дастаць якую небудзь загранічную пазыку.

Мы, прадстаўнікі беларускіх працоўных мас, зьяўляемся заўзятымі ворагамі гэтых пазыкаў. Мы ведаем і асьцерагаем сялян і работнікаў, што гэтыя пазыкі ня толькі ня будуць якім-небудзь ратункам, але маюць быць новай пятлёю на нашыя шыі, цяжарам ня толькі на нас, але—магчыма — і на нашы дзеці. Пазыка гаспадарчага жыцьця ня аздаравіць і ня выкіне крыніцаў крызісу. Кожную пазыку пражорлівая буржуазія праесьць, прамарнуе на новыя вастрогі, на новыя казармы, на новыя паліцэйскія гэрбы і мундзіры, на забойчыя, праступныя ваенныя прыгатаваньні.

Дзеля гэтага паведамляем, што сяляне і работнікі пазыкі гэтае ня прызнаюць і выплачваць! яе крэдытарам ня будуць.

Але-ж, паны, апіраеце на яе ўсе свае надзеі І штож? Вось вашыя загранічныя „апякуны“ ня хочуць вам яе даць, бо ведаюць, што вы зьяўляецеся банкрутамі,—бо вам ня вераць. Загранічны капітал заўсёды паслугоўваўся польскай буржуазіяй толькі як аружжам, а цяпер нават гэтае аружжа адкідае, як бескарысную рэч. Працоўныя масы, якія мелі быць для гэтага загранічнага капіталу толькі гарматным мясам і гноем, бачаць, што польская буржуазія гатова за юдавы сярэбранікі прадаць найжыцьцёвейшыя інтарэсы краю.

Ужо час нарэшце зразумець, што цяперашні крах другой падрад польскай валюты — гэта-ж ёсьць катастрофа гэтай буржуазна-абшарнічай, мілітарыстычнай, імпэрыялістычнай і шовіністычнай Польшчы, якую штучна і інфляцыйна — г. зн. за шырока,—цаною рэальнай вартасьці і трываласьці яе—разбудоўвалі ад Вэрсалю да цяперашняй хвілі.

Бо чым-жа фактычна зьяўляецца валюта?

Валюта гэта фінансавае аблічча духовага, гаспадарчага і палітычнага здароўя краю.

Аб маральна-духовым стане здароўя польскага грамадзянства хіба-што ня трэба пераконваць паноў, бо-ж самы дасканальна ведаеце і чулі аб тых бесканечных надужыцьцях, зладзействах, крадзежах і грашавых растратах нават у пракураторыях, забойствах і самазабойствах, паліцэйскіх пытках і катаваньнях, хабарах і гэт. дал. і г. д.; рэгістрацыю гэтых адзнакаў маральнага стану Польшчы можна прадаўжыць да бесканцовасьці.

Гэта — яркая і непамыльная адзнака вось іменна гэтае няверы польскага грамадзянства ў моцную будучыну ўваскрошанае Польскае Дзяржавы.

З гэтае „хваравлівае няверы — скажу славамі п. Прэзэса Карпінскага і плывуць гэтыя праступныя імкненьні за ўсялякую цану скарыстаць з бягучае хвіліны.—Што злавіў, то—твае!

А ведама-ж, што гаспадарчае здароўе зусім залежыць ад здароўя духовае энэргіі грамадзянства, як таксама гэтае апошняе ад адпаведных вонкавых і **ўнутраных** палітычных варункаў, неабходных для свабоднага і карыснага зужыцьця энэргіі.

І вось трэба **катэгорычна** сьцьвердзіць, што ніякога з гэтых неабходных варункаў для здароўя валюты да гэтай пары пануючая польская буржуазія **не стварыла.**

Вонкавыя варункі спакойнага істнаваньня Польшчы, а перадусім яе граніцы, як гэта мусіла сьцьвердзіць нават камісія да замежных спраў.—цяпер можа болей, чым калі-небудзь, ня пэўныя. Бо, калі-б пан Скшыньскі сам верыў у тое, што ён гаварыў у камісіі аб Лёкарнскіх гарантыях для Польшчы, дык нашто ён меў паведамляць катэгорычна, што ваенны бюджэт ня можа быць зьменшаны?

Добрая валюта адначасна ёсьць выражэньнем палітычнага здароўя і сілы дзяржаўнага арганізму, што ёсьць магчымым толькі пры ўнутраным сацыяльным і нацыянальным ладзе.

Але нават мінімуму гэтага ладу ў Польшчы няма. Ня можа быць сталай валюты ў дзяржаве, якая каля 40% сваіх грамадзян, частка якіх — славянскія меншасьці, пражываючыя зьбітаю масаю на палове яе дзяржаўнае тэрыторыі, разглядае і трактуе, як ворагаў яе істнаваньня. Ня можа быць здаровай і моцнай валюты ў краі, дзе з свайго боку гэтыя 40% польскіх грамадзян адчуваюць гэтую дзяржаўнасьць, як найгоршага ворага, ня толькі свайго духовага жыцьця і разьвіцьця, але папросту свайго фізычнага жыцьця. Бо-ж ня можа быць унутранага здароўя і вонкавай помачы ў дзяржаве, якая сьведама задалася мэтаю сьмяротнай барацьбы з 13 мільёнамі сваіх грамадзян, якая вядзе фактычную і сталую дамашнюю вайну з гэт. зван. меншасьцямі, якія зьяўляюцца часткамі вялікіх і ўжо дасьпелых да самастойнага і незалежнага дзяржаўнага быту народаў.

Ня можа мець сталай і здаровай валюты тая дэмакратычная дзяржава, якая, для падтрыманьня ўнутранага ладу, утрымоўвае на сваёй тэрыторыі паліцыі, войска ў 10 разоў болей, чым тыя папярэднія, захапіўшыя яе — манархіі, якія згінулі іменна ад мілітарнага надмеру, паліцэйскага гвалту над паняволеннымі народамі.

Толькі тады ў Польшчы можа быць створана магучая і здаровая валюта, калі яе ўнутраныя і вонкавыя „міжнародныя“ адносіны будуць радыкальна перабудаваны на падставе добравольных, свабодных і роўных умоваў.

Толькі тады ня трэба будзе для падтрыманьня панаваньня аднаго народу над другім выкідаць і марнаваць, без найменшай урэшце надзеі, на моцны посьпех болей чым паловы ўсяго дзяржаўнага бюджэту.

Гэта ўсё, што найболей шкодзіць і губіць польскую валюту, але аб гэтым ані слова не сказаў новы лейб-мэдык міністар Зьдзехосўкі, ані сам прэм'ер Скшыньскі.

П. Мін. Зьдзехоўскі многа гаварыў аб ашчаднасьцях, абяцаў у імя Рэчы Паспалітай зьменшаньне падаткаў на войска. Але ці-ж гэта не зьяўляецца толькі славамі? Ці-ж пару тыдняў таму назад яго шэф п. граф Скшыньскі не сказаў чагосьці, зусім праціўнага, — што вайсковы бюджэт так нятыкальны, як „табу“ ў мурынаў“?

Калі возмем бюджэт на першы квартал 1926 г., то пераканаемся, што выдаткі разложаны гэткім чынам: на войска асыгноўваецца 134,248,800 зл., ці 33 проц. усяго бюджэту, на адміністрацыю і паліцыю—11 проц., на асьвету 14,5 проц., тады як школаў беларускіх ня маем. Застаўшыяся 19 пачатковых беларускіх школ цяперашнім міністрам Асьветы ператвараюцца на двуязыковыя. Гімназіі, якія маем, утрымоўваем уласнымі высілкамі-ахвярнасьцяй беларускага грамадзянства, бо з дзяржаўнага скарбу ані гроша на беларускую асьвету не атрымоўваем.

Расход на першыя тры месяцы 1926 году прадбачыцца ў суме 406,727,236 злот., а, калі возьмем пад увагу, што падаткі на самаўрады выносяць гэтакую-ж самую суму, то разам выйдзе, што з зьбяднеўшай люднасьці беларускіх і украінскіх зямель, а таксама і люднасьці каранной Польшчы сьцягнецца болей чым 813 мільёнаў злотых.

Як селянін, так і работнік мусяць ведаць, што з кожнага злотага, узятага з яго на падатак, 33 грошы йдзе на ўтрыманьне польскага войска, 11% на паліцыю і шпікоў, 14,5 грошаў на польскія школы, а рэшта на ўтрыманьне ўсяго надмернага дзяржаўнага апарату.

Мы ведаем, што ў гэтым выпадку праўду казаў п. Скшыньскі, а ня п. Зьдзехоўскі, хоць гэты апошні, здавалася, гаварыў шчыра; п. Мін. Скарбу аказаўся тут лепшым дыплёматам, чым яго калега — дыплёматычны спэцыяліст.

П, Мін. Зьдзехоўскі ў запрапанованым праекце фактычна хоча нібы зьняць якуюсьць муху з вайсковага польскага воза, і паны можа цяпер будзеце крычаць, што коням цяпер будзе далёка лягчэй. Але скуль-жа?

Бо-ж аб зьмяншэньні падаткаў нічога ня сказана! Ведаем мы, што за кожны грош, адняты ў войска, п. Міністар і ўсе паны будуць абцінаць соткі і тысячы працоўнікам, больніцам, безработным, удовам, сіротам і інвалідам!

Гэта ёсьць і будуць фактычнымі ашчаднасьцямі буржуазіі. Буржуазіі польскай можа не хапіць на зямельную рэформу, але заўсёды хопіць на гарматы і вастрогі.

Цяперашні ўрад называецца ўрадам нібы коаліцыйным, і належаць да яго, паміж іншымі, і польскія сацыялісты. Чуем запэўніваньні, што гэтая коаліцыя зроблена на тое, каб аслабіць клясовую барацьбу, каб не пагаршаць палажэньня працоўных масаў. Але што-ж фактычна бачым? Безрабоцьце шырыцца, як зараза— да 250.000 безработных! Нэндза ў вёсках і мястэчках горшая, чым калі небудзь. А колькі-ж там стараючыхся знайсьці працу? Дакладна ведаем, што ў Віленшчыне беларускі селянін, якому патрэбны грош, каб заплаціць падаткі, йдзе на заробак у маёнтак і атрымоўвае у дзень за сваю працу 60 грашоў і то літэральна 60 грашоў, а кабета 50 грашоў.

Далей дарагавізна шалее. Спэкуляцыя выробляе нябывалыя рэчы. Гэткая работа валадаючых клясаў, гэткая іх палітыка пры цяперашнім коаліцыйным урадзе! Буржуазія ня думае ні аб якай уступчывасьці. Буржуазія стала павялічвае эксплёатацыю і ўціск, імкнецца выразна да катастрофы. За плячамі коаліцыі прыгатоўваюцца фашыстаўскія замахі.

Паны, мы паведамляем, што, калі буржуазія ўсімі сваімі сіламі імкнецца да згубы, то народныя масы не дадуцца ўпіхнуць сябе ў пропасьць. Працоўныя масы лічаць цяперашнюю ўрадавую коаліцыю за баёвы супольны фронт рэакцыі проці сябе і праціставяць яму свой супольны фронт рэвалюцыйнай барацьбы.

Мы, прадстаўнікі Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, паведамляем, што адкідаем бюджэтны праект, запрапанаваны цяперашнім урадам, выказваем гэтаму ўраду барацьбу і імкнемся да стварэньня сялянска-работніцкага ўраду, які — і толькі ён—зможа перамагчы крызіс, стасуючы паміж іншым наступныя срэдствы:

1) Прызнаньне тэрыторыяльным меншасьцям поўнага права самавызначэньня.

2) Разбраеньне і мірную палітыку,

3) Амністыю для палітычных вязьняў, скасаваньне выняткавых уставаў,

4) Змаганьне з безрабоцьцем, дарагавізнай і спэкуляцыяй, увядзеньне работнічага кантролю над прадукцыяй і абменам,

5) Звальненьне ад падаткаў працоўных масаў і абцяжваньне гэтымі падаткамі валадаючых клясаў і

6) Заключэньне гаспадарчага і палітычнага саюзу з С. С. Р. Р.

Інтэрпэляцыя № 6

паслоў Клюбу Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады да пана Міністра ўнутраных спраў — у справе беспадстаўнай і бяспраўнай канфіскацыі № № 14 і 15 газэты „Жыцьцё Беларуса“

Падрад 2 нумары выходзячай у м. Вільні беларускай газэты „Жыцьцё Беларуса“ ізноў падпалі чарговай канфіскаце па загаду Камісара Ураду на м. Вільню п. Вімбора.

Гэты апошні падвойны акт рэпрэсіі над многапакутнай беларускай газэтай зьяўляецца асабліва выдатным, дайшоўшым да апошніх рубяжоў адміністрацыйнай самаволі і бяспрыкладнага надужыцьця ўлады.

№ 14 газэты „Жыцьцё Беларуса“ сканфіскаваны за 3 артыкулы. Першы арт. пад загалоўкам „Новы замах на Базыльянскія муры“ зусім спакойна й аб'ектыўна падаў грамадзянству дакладную інфармацыю аб тым, што адбылося 22. Х. у былом памешканьні Беларускай пачатковай школы ў Вільні, якое памешканьне — было занята на точнай падставе істнуючых у Польшчы законаў уласьнікам і валадаром усяго гмаху муроў і праўным арэндатарам яго часткі — мясцовай уладай Праваслаўнай царквы і аднэй з беларускіх дабрадзейна-культурных установаў.

Артыкул спакойна паінфармаваў грамадзянства аб тым, як у гэтае памешканьне зьявіўся атрад паліцыі і згодна з атрыманым загадам тагож Камісара ўраду гвалтам выкінуў вучняў Правасл. Сэмінарыі і дзяцей з Белар. Прытулку Тав. Помачы Ахварам Вайны.

Да артыкулу былі прыложаны 2 тэлеграмы, высл. Старшынёй камітэту Белар. Таварыства Помачы Ахвярам Вайны п. Астроўскім да п. Міністра Справядлівасьці, з копіямі пану міністру ўнутр. спраў і паслу Тарашкевічу і п. Рэктарам Віленскай Прав. Сэмінарыі япіскапам Антоніем да Варшаўскага Праваслаўнага Сыноду, з копіямі п. міністру Рэлігіяў і Публічнай Асьветы і ўнутраных спраў.

(Далей ідзець даслоўны зьмест сканфіскабанага артыкулу „НОВЫ ЗАМАХ НА БАЗЫЛЬЯНСКІЯ МУРЫ“).

Скрыць гэты факт, выклікаўшы вялікае абурэньне ў беларускім грамадзянстве, яго прэсавы орган ня меў права, тым больш, што па месьце цыркулявалі самыя фантастычныя і хвалючыя весткі, асабліва пасьля нядаўнага вынаходу ў тых-жа Мурох „дынаміту“... а ўся мястовая прэса падала аб здарэньні абураючыя, нягодныя з праўдай і яўна інсьпіраваныя п. Студніцкім інфармацыі.

Другі з канфіскаваных артыкулаў „Хто мы такія“ (Голас беларускаго настаўніка) не зьмяшчае ў сабе ані воднаго рэзкага слова, зьвяртаецца да беларускіх сялян, каб яны добра ведалі, што яны—беларусы, і дамагаліся, па праву, сваей роднай школы.

(Далей ідзе даслоўны зьмест сканфіскаванага артыкулу пад загалоўкам „ХТО МЫ ТАКІЯ“ (Голас беларускага настаўніка).

Трэці „праступны“ артыкул—кароткая хронікёрская заметка аб толькі што выкананым школьнай ўладай пераносе адзінай астаўшайся ў м. Вільні беларускай пачаткавай школы з цэнтру места (з тых-жа Базыльянскіх муроў...)—на самы яго край—за праваслаўныя могілкі, дзе гэтая апошняя школа павінна будзе бясспрэчна захірэць і кончыць сває жыцьцё—дзеля свае вялікае адлежнасьці ад места. Гэтая бязвінная нататка гласіла так:

(Далей даслоўна прыводзіцца ў інтэрпэляцыі гэтая нататка пад загалоўкам „ПРЫСУД СЬМЕРЦІ АПОШНЯЙ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЕ“).

Наступны № 15 газэты быў, як другі наклад зроблены вельмі аглядна: Усе сканфіскаваныя артыкулы былі выкінуты, пакінуты ўвесь несканфіскаваны матэрыял, дапоўнены бягучай інфармацыяй. У справе здарэньня ў Базыльянскіх Мурох пакінуты толькі абедзьве тэлеграмы Старшыні Белар. Каміт. помачы пацяр. ад вайны, п. Астроўскага і рэктара Прав. Дух. Сэмін. ў Вільні Япіскапа Антонія з скаргамі на надужыцьці мястовай адміністрацыі да яе найвышэйшых уладаў рэспублікі.

Тэлеграмы гэтыя, як прынятыя на Дзяржаўнай Пошце, зьяўляючыяся афіцыяльным дакумэнтам у справе, рэдактар газэты ня меў падставаў лічыць праступнымі.

Калі-б гэтыя тэлеграмы зьмяшчалі нешта праступнае, дык яны не маглі быць прыняты на пошце, і ў-ва ўсякім выпадку іх аўтары павінны былі-б быць прыцягнуты да адказнасьці іх высокімі адрэсатамі—панамі міністрамі цэнтральнага Ураду Рэспублікі. З другога боку, канфіската ў газэце тэлеграмаў праз тую самую мястовую адміністрацыю, на паступаньне якой пасланы вышэйшым уладам матываваныя скаргі, зьяўляецца бясcумлiўным і бяспрыкладным надужыцьцем мястовай адміністрацыйнай улады.

Д[illegible] ўсяго гэтага трэба дадаць, што тыя тэлеграмы былі зьмешчаны ў атрыманым у Вільні яшчэ да выхаду канфіскаванага № 15 беларускай газэты ў нумары варшаўскай расейскай газэты „За Свабоду“ і ўжо пасьля дня канфіскаты ў варшаўскай польскай газэце „Robotnik“. Абедзьве варшаўскія газэты ані ў Варшаве, ані ў Вільні сканфіскаваны за гэта, зразумела, ня былі!

Апрача гэтых тэлеграмаў, п. Камісар Ураду ўказаў яшчэ адзін крымінальны артыкул у № 15 газэты: „Апэляцыя украінцаў да сусьветнай апініі“

(і тут-жа быў прыведзены даслоўны тэкст гэтага артыкулу).

Але-ж, першае,—артыкул гэты толькі скарочаны перадрук з украінскіх газэтаў (глядзі „Діло“ № 234 і „Украінскі Голас“ № 44), дзе пратэст украінскіх паслоў, заяўлены жэнеўскай прэсай, быў пададзены самым урадавым П. А. Т-ам і быў надрукаваны поўнасьцю, ня гледзячы на істнуючую ў Аўстр. Галіччыне папяр. цэнзуру. Але найбольш абураючым зьяўляецца тое, што гэты самы артыкул, сканфіскаваны ў № 15, быў поўнасьцю, без найменшых перамен, надрукаваны ў папярэднім № 14 тэй жа газэты і ня быў сканфіскаваны... Калі аб гэтым было заяўлена рэдактарам газэты прэсаваму рэфэрэнту пана Камісара, той сьпярша заявіў, што гэтага не магло быць. Але, пераканаўшыся ў ідэнттычнасьці абодвых друкаў, сказаў, што гэта ўсё роўна: не дагледзілі тады, дык паправіліся цяпер...

Гэта ўжо выразна граніччыць са зьдекам...

Што гэтыя акты бяспрыкладнага надужыцьця ўлады не зьяўляюцца чымся прыпадковым, але, наадварот, добра ўплянаванай сыстэмай, тасаванай да беларускай прэсы, аб гэтым выразна сьведчаць вынікі толькі-што адбыўшыхся 2 судовых працэсаў у справе рэдактароў Састала і ўпорна канфіскаваных і зачыняных беларускіх газэтаў у Вільні.

На першым працесе рэдактар быў апраўданы па ўсім абвінавачаньням за цэлы рад артыкулаў па 129 арт. К. К., а засуджаны толькі за непашану ўлады.

Другі працэс—яшчэ паказальней: з 14 крымінальных“ артыкулаў, паводле § 263 К.К. за 11 артыкулаў рэдактар быў апраўданы (каля 80%) і за 3 засуджаны на 1 месяц арышту, або 100 злотых кары грашыма.

Нават пасьля гэтак характэрнага судовага працэсу, местная адміністрацыя і надалей вядзе сваю тактыку беспадстаўнага перасьледаваньня беларускае прэсы і яе матэрыяльнага руйнаваньня.

Падаючы ўсё гэтае да ведама п. Міністра Унутраных Спраў пытаем:

1) Ці маніцца п. Міністар пацягнуць да адказнасьці п. Камісара Ураду на м. Вільно за сыстэматычнае надужываньне ўлады, праяўляючаеся ў пастаянным канфіскаваньні ім беларускіх газэт і то нават за зьмяшчэньне афіцыяльных інфармацыяў П. А. Т. і таксама за друкаваньне скаргаў да найвышэйшых уладаў на гэтую яго самаволю?

2) Ці і што маніцца зрабіць, каб Камісар Ураду ў м. Вільні перастаў у канцы канцоў вясьці дзікую практыку перасьледаваньня ў адносінах да апазыцыйнае беларускае прэсы?

Варшава дня 19 лістапаеа 1925 г.

Інтэрпэляцыя № 12

паслоў Клюбу Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады да п. Міністра Унутраных Спраў у справе захоўваньня асаднікаў, маючых аружжа і жаўнераў К. О. П. ў адносінах да мясцовай людкасьці.

Ня раз ужо беларускія паслы зварочвалі ўвагу п. Міністра на брутальнае захоўваньне жаўнераў і агэнтаў К. О. П. у адносінах да мясцовай беларускай людкасьці, з выпадкамі біцьця, як гэта было з Беганскім Сыльвэстрам і яго сястрою — з в. Костыкі, Косьценевіцкай гм., Вялейскага пав.,—якога проста паддаваў пыткам агэнт палітычнай паліцыі пры 10 баоне К. О. П.—Малікоўскі і сяржант Мундо ў м. Красным, Вялейскага пав.

Дазнаў мукаў у канцылярыі гэтага-ж баону ў Красным і селянін Андрэй Ракецкі з в. Чорнаруча, Олькавіцкай гм., Вялейскага пав. Ракецкага, таксама як і Беганскага, білі аж да ўтраты прытомнасьці і пры гэтым білі і катавалі нялюдзкім спосабам.

У гэтым-жа годзе ранены быў выстралам жаўнераў 10 баону селянін Пётра Дулькевіч з в. Вялікі, Радашкоўскай гм., Вялейскага пав. Гэты Дулькевіч самым нялюдзкім і дзікім спосабам быў катаваны ў тым-жа мястэчку Красным пры камэндзе 10 баону К. О. П.

Увесну гэтага-ж году жаўнерамі К. О. П. быў забіты каля свайго ўласнага дому солтыс в. Брыкалаўшчына, Ланскае гм., Нясьвіжскага пав. Лаўрэн Лях.

Амаль-што адначасна агэнты памянёнага баону дзікім і нялюдзкім спосабам забілі — бо зроблёна было аж 35 ранаў—млынара з в. Сыцэвічы, Радашкаўскай гм. Вялейскага пав. — Антона Вайтовіча, а таксама былі акалечаны яшчэ некалькі асоб.

У пачатку гэтага-ж году чатырох п'яных, але ўзброеных жаўнераў К. О. П. з пастарунку Людвікова ўварваліся на вясельле ў в. Хамічы, Мікалаеўскай гм., Дзісьненскага пав., дзе пачалі біцца, разганяючы сабраўшыхся і страляючы з ружжаў у людзей. У рэзультаце гэтага быў забіты куляю ў плечы Лазоўскі Уладзімір, селянін з в. Поржанкі,— чатыры асобы цяжка ранены, а некалькі асоб лягчэй ранена; усе раны ад выстралаў. Ад кінутай адным жаўнерам гранаты на часткі разляцелася хата, дзе было вясельле.

Аб гэтай невялічкай частцы так многіх і дзікіх выпадкаў на нашых землях складалі мы ў сваім часе інтэрпэляцыі, заклікваючы п. Міністра, каб затрымаў ён сваяволю жаўнераў з К. О. П.,—заклікалі — каб перасталі яны біць і зьдзекавацца над мясцовай людкасьцяй, каб як-сьлед пакараў асобы, якія рабілі гэтыя зьдзекі над безбароннымі жыхарамі нашых вёсак і мястэчак, каб урэгуляваў і выплаціў страты ўдовам і сіротам забітых, а таксама акалечаным.

На жаль ані ў водным з вымененых выпадкаў ня зроблена па справядлівасьці: да гэтага часу ніякіх вынагроджаньняў не атрымалі ані тыя, што, дзякуючы пыткам, робленым агэнтамі К. О. П., патрацілі здольнасьць да працы, ані тыя, што засталіся акалечанымі стрэламі п'яных жаўнераў, ані семьі забітых.

Беларуская вёска стараецца наагул як мага меней мець сутычнасьці з жаўнерамі, бо заўсёды ад іх мае толькі зьдзекі, часта катаваньні, а нават і сьмерць.

Дзеля гэткіх прычын беларуск людкасьць наагул байкатуе польскага жаўнера ня хочучы мець з ім нічога супольнага. Жаўнеры-ж на паграніччу, будучы адны і адцятыя ад сьвету, стараюцца навязаць зносіны з суседнімі вёскамі. Гэта ўрэшце робіцца з дазволу і благаславеньня вайсковае ўлады, якая, відаць, мае добра абдуманы плян злучэньня мясцовай беларускай людкасьці з польскім жаўнерам. Але гэтая сыстэма злучэньня, гэты новы способ польшчаньня нашае людкасьці праз сужыцьцё з польскім жаўнерам вельмі адчувае наш беларускі селянін на сваёй уласнай скуры, бо адначасна з польскім жаўнерам украдаецца на вёску здэмаралізаваны і дэмаралізуючы зародак гэтак званае „вайсковае разьведкі“ разам з п'янствам, а потым — зразумелая реч — йдуць зьдзекі: правакацыя, катаваньне і г. п.

Цяпер польскі жаўнер, заўсёды няпрошаны ўрываецца на вясковыя гуляньні, пачынае біцца, што заўсёды дрэнна канчаецца для мясцовай людкасьці, бо жаўнер мае прывычку йсьці на гуляньне ўзброенным, што найменш, халодным аружжам.

Вось адзін з нязьлічаных выпадкаў адносінаў польскіх жаўнераў да мясцовай людкасьці: 16-га жніўня 1925 г. ў фал. Малыя Бакшты, Радашкаўскае гм., Вялейскага пав. былі пабіты па дарозе з в. Максімаўка да в. Загорцы ў 7 гадз. ўвечары музыкант з в. Загорцы Андрэй Спэцыян 19 гадоў і Андрэй Акуліч сын Дамініка 23 гадов з вёскі Максімаўка. Гэтыя асобы вярталіся ў гэтым часе пасьля гуляньня ў в. Максімаўку да в. Загорцы, а жаўнеры з 10 баону, схаваўшыся, напалі на іх, страшна зьбілі, паламалі гармонік Андрэя Спэцыяна і ўкінулі яго ў возера. Віноўнікаў гэтага нападу не каралі.

У гэтым жа часе асаднік з фал. Сыцэвічы нацкаваў сабакамі на праходзячую каля яго асады сялянку Тацяну Ключнік з в. Клімонты,—і сабакі зусім парвалі адзежу гэтае кабеты.

Нарэшце апошні выпадак, які меў месца 15 лістапада сёлеш. г. ў казармах вайсковае стражы ў Малых Бакштах, дзе ў часе вясковага гуляньня, на якое прышло многа вясковай моладзі, вайсковы асаднік кінуў ручную гранату, ад якой панёс сьмерць адзін жаўнер, будучы забіты на месцы і 13 асоб ранены: 6 жаўнераў і 7 асоб вясковае моладзі з вёскі Максімаўка, Радашкаўскае гм., а іменна: Настуля Ярук—22 гадоў, Уладзімер Руды—19 гадоў, Міхал Баран—22 гадоў, Мікалай Ключнік—19 гадоў, Антоля Ходзька—17 гадоў, Анна Ключнік—19 гадоў і Зіна Ключнік—17 гадоў.

Траіх прысутных на гуляньні асаднікаў арыштавалі, а обыск, зроблены ў іх памешканьнях даў наступны рэзультат: у аднаго з асаднікаў знайшлі 2 гранаты, а ў другога—4. Аднак, ня гледзячы на гэта памяненыя забойцы звольнены з-пад арышту,—відаць, як прадстаўнікі прывілеяванай клясы, тады як арыштаванага за што-небудзь беларуса трымаюць у вастрозе вельмі часта па тры гады да суду. Прыкладам гэтакіх адносінаў судовае ўлады да беларусаў можа служыць арыштаваны ў 1923 годзе 28 жніўня селянін Хаценчыцкай гм., Вялейскага пав. — Янка сын Піліпа Дзік з вёскі Дворац, Янка сын Янкі Дзік і Пётра сын Нікапора Дзік з в. Рабцы.

Дзеля вышэйсказанага пытаемся п. Міністра:

1) Ці маніцца п. Міністар загадаць, каб была адабрана ў вайсковых асаднікаў на гэт. зв. „Крэсах Усходніх” усялякае аружжа, як агнястрэльнае, так і халоднае, а таксама гранаты і паляўнічыя ружжа?

2) Ці маніцца п. Міністар вызначыць суровае сьледзтва, каб выкрыць вінавайцаў замаху на вясковую моладзь, сьцягнутую 15. XI. да стражніцы 10 баону К. О. П. у Малых Бакштах і пакараць віноўных?

3) Ці маніцца п. Міністар загадаць, каб удаве пасьля забітага ў часе выбуху бомбы жаўнера К. О.П. Міхала Кавальца, а таксама і тым акалечаным цывільным асобам, што будуць прызнавацца за нездольных да працы, была вызначана дажыцьцёвая пэнсія?

5) Ці маніцца п. Міністар загадаць, каб жаўнеры К. О. П. былі аддзелены ад беларускае вёскі і гэтым самым даць магчымасьць мясцовай людкасьці рабіць свае традыцыйныя вясельлі і гуляньні?

6) Ці маніцца п. Міністар загадаць, каб былі пакараны жаўнеры К, О. П. з стражніцы Малыя Бакшты, учасьнікі нападу 16. VIII. с. г. на Андрэя Акуліча і Андрэя Спэцыяна, а таксама, каб выплацілі апошнім вынаграджэньне за зробленыя ім матэр'яльныя страты.

Варшава, 8 XII. 1925 г.

Інтэрпэлянты.

Выдавец:
Пасольскі Клюб Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады.

Друкарня Н. Левін і Сын Вільня, Нямецкая 22.